Любімаму Кім Чэн Іру ўсяго 60 гадоў!

http://navinki.port5.com

НАВІНКІ

20 - 27 ЛЮТАГА 2002 №2 ОДНЫ

З ДНЁМ АБАРОНЦЫ АЙЧЫНЫ, ДАРАГІЯ МУЖЧЫНЫ!

Спонсар вокладкі — часопіс для вайскоўцаў Forum Lambda

Першы невяртанец!



Канфуз чарговы раз напаткаў Беларускую алімпійскую зборную: аматар паскакаць з трампліну на лыжах Лыскавец вырашыў увогуле саскачыць зь Беларусі. Паводле чутак, ён папрасіў палітычны прытулак у ЗША. Беларускі НАК абвяргае гэтую інфармацыю й сьцьвярджае, што спартсмэн нібыта «застаўся крыху падзарабіць на жыцьцё». Працяг спартовай тэмы на СТАР. 7

Прыйшоў канец тэрору!

Беларускія банкі спыняюць усялякія фінансавыя апэрацыі з тэрарыстамі.

Стар. 2

100 ДНЕЙ ДА ПРЫКАЗА

на стар.4-5

Міжнародная панарама

на стар. 8

Газэта «Навінкі» выходзіць зь лютага 1998 г. Зарэгістраваная ў Дзяржаўным камітэце па друку Рэспублікі Беларусь 23.02.1999 г. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі №1272. Заснавальнікі: П.Канавальчык, А.Новікаў, А.Мазур. Галоўны рэдактар Паўлюк Канавальчык. Падпісны індэкс **63439**. Адрас для карэспандэнцыі: п/с 33, 220134 Менск, БЕЛАРУСЬ; E-mail: navinki@ring.by; Адрас рэдакцыі: г.Менск, пр.газ.«Известия», 9-143.

Нумар падпісаны да друку 20.02.2002г., а 00.01. Тыраж 4200 экз. Надрукавана з гатовых дыяпазытываў у друкарні ТДА «Знаменіе», г. Менск, вул. Кальварыйская, 24. Заказ №280

НавІнкі ў тЭстах

Ці ў курсе вы апошніх падзеяў?

1. Чым скончылася акцыя Маладога Фронту, прысьвечаная Дню закаханых?
А) Групэнсэксам ва ўправе БНФ.
Б) Малітвай ва ўрочышчы Курапаты.
В) Штурмам прэзыдэнцкага палацу й поўнай перамогай дэмакратыі.

2. У якім відзе спорту беларускі спартовец А.Грышын узяў бронзавы мэдаль?
А) У фрыстайле.
Б) У гульні ў ножыкі.
В) У 64-клеткавых шашках па вэрсіі ФІФА.

3. Які беларускі горад адзначае зараз 900-годзьдзе?
А) Вільня.
Б) Барысаў.
В) Тэль-Авіў.

4. Хто завочна атрымаў рок-карону за мінулы год?
А) Рок-гурт КРАМА за адзіны студыйны альбом «Хавайся ў бульбу».
Б) Юры Цыбін за арганізацыю Рок-Каранацыі.
В) Ціхановіч і Паплаўская за перадачу «Хіт-момант».

5. Якую ўзнагароду атрымаў горад Бабруйск за лепшыя сацыяльна-эканамічныя паказчыкі?
А) Статус сталіцы яўрэйскай аўтаномнай акругі.
Б) Магдэбурскае права.
В) Пераходны Чырвоны сьцяг і 1200 мінімалак.

6. Беларусазнаўцы адмаўляюцца публікаваць дзёньнікі М.Багдановіча, бо адпаведна іхнаму зьместу:
А) Лукашэнка – унучаты пляменьнік Максіма.
Б) Багдановіч быў сябрам менскай філіі Саюзу Рускага Народу імя А.Суворава.
В) Багдановіч падчас адпачынку ў Ялце брудна ціскаўся зь дзяўчынамі.

7. На якое мерапрыемства ў Менску ўваход каштуе да 110 тыс. рублёў (65 даляраў)?
А) Канцэрт Алы Пугачовай і Максіма Галкіна.
Б) Пікет за вызваленьне дэпутата Клімава.
В) Выстава сельскагаспадарчай тэхнікі ў палацы Бел-Экспа.

8. Зь якой мэтай паехалі беларускія дэмакраты ў Страсбург?
А) Каб прыгнаць патрыманыя іншамаркі.
Б) Каб паўдзельнічаць у сэсіі АБСЭ і прыкласьці намаганьні па працягваньні дыялёгу сярод палітычных сілаў Беларусі.
В) Каб падкалыміць трохі грошай у якасьці бэбі-сытэраў.

9. Беларуская Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя БНФ прапанавала арганізаваць у 2002 годзе:
А) Выбары прэзыдэнта РБ адпаведна Канстытуцыі 1994.
Б) Гей-прайд.
В) Кланаваньне Пазьняка.

10. Якія катэгорыі насельніцтва, згодна *Нашай Свабодзе*, будуць карыстацца ільготамі на праезд у транспарце ў выніку бліжэйшых рэформаў?
А) Вэтэраны англа-бурскай вайны 1990 і сябры іхных сем'яў.
Б) Ніякія.
В) Студэнты вайсковай катэдры.

11. Сярод якой часткі беларускага грамадзтва, па словах спікера Савету Рэспублікі А.Вайтовіча, найбольш угноеная глеба для тэрарызму?
А) Сярод пісьменьнікаў і навукоўцаў.
Б) Сярод чытачоў газэты *Рыбалка и охота*.
В) Сярод хранічна хворых на дыябэт.

Правільныя адказы: 1-Б, 2-А, 3-Б, 4-А, 5-В, 6-В, 7-А, 8-Б, 9-А, 10-В, 11-А.

Тэрарыстаў не абслугоўваем!

Пастанова Нацыянальнага Банку №10 «Аб спыненьні прыходных і расходных апэрацыяў па рахунках тэрарыстаў, тэрарыстычных арганізацыяў і асобаў, зьвязаных зь імі» (рэг. №8/7773 ад 7.02.2002) выклікае шмат законных пытаньняў. Па-першае, колькі павінна быць крывавых кліентаў у беларускіх фінансістаў, каб узбудзіць гэткую ўвагу НБІ. Узгаданы вэрдыкт Пракаповіча відавочна сьведчыць аб тым, што разнастайныя камікадзы, маджахеды, унабомбэры і сэпаратысты дагэтуль мелі вялікія дэпазыты ў ББВ, БеларусБанку і г.д. Па-другое, калі так, што рызыкуе атрымаць у выніку такога дэмаршу НБ наша эканоміка? Напярэдадні выдзяленьня крэдытаў на пасяўную, адказ відавочны: пагаршэньне інвэстыцыйнага клімату, голад і сацыяльную нестабільнасьць.

Дык ці варта падлізвацца да амэрыканцаў пры дапамозе кан'юнктурных і, у рэшце рэшт, антырыначных пастановаў? Імідж краіны гэтым усё роўна не палепшым, а атрымаць дадатковых «абманутых укладчыкаў» у асобе Усамы бэн Ладэна і Басаева Пракаповічу нават мы б не пажадалі. Трэба думаць галавой... пакуль яна ёсьць ●

Тамара Віньнікава,
старшыня Нацбанку РБ у выгнаньні

Саюз нерушымы... газэтаў дзяржаўных

Вось так прыкладна будуць выглядаць цэнтральныя дзяржаўныя газэты пасьля прэзыдэнцкага «ўзбуйненьня»

Для Паўла Якубовіча й іншых ягоных калегаў па дзяржаўным сэктары СМІ настаюць неспакойныя часы. Повадам для граньня ачком флягманаў прэзыдэнцкай прапаганды паслужылі чуткі пра нібыта рыхтаванае ў кулюарах Адміністрацыі ППРБ скарачэньне колькасьці бюджэтных газэт. Маўляў, досыць карміць гэтых дармаедаў, ад якіх карысьці як ад казла фінансавых інвэстыцыяў. Выхад з сытуацыі на К.Маркса, 38 бачыцца наступны: закрыць частку нерэнтабэльных дзяржаўных выданьняў, каб перакінуць гэтыя сродкі на падтрымку, напрыклад, вясновага севу. Вядома ж, сацыяльная стратэгія нашага ўраду не дазваляе выкінуць няўдалых шаўкапёраў у падваротню. Таго й глядзі, нырнуць у нейкі апазыцыйны ліст ком кшталту *Народнай Волі*. Але й тут знойдзенае геніяльнае рашэньне гэтага рэбусу – тупа аб'яднаць два-тры працоўныя калектывы ў адну рэдакцыю, якая й нанясе фатальны ўдар вострым пяром у пах шматгаловай гідры буржуазна-дэмакратычнай прэсы. Праўда, пакуль што застаецца невядомым, каго з кім пратусуе сьветлы розум Галоўнага журналіста і як на выхадзе будуць гучаць назвы ўзбуйненых газэт-бюджэтасосаў ●

Крыша для ЗБС

Навіна пра тое, што сярод белага дня паднялі хату Задзіночаньня Беларускіх Студэнтаў высадзіла на ізьмену ўсе няўрадавыя арганізацыі краіны. Як гэта так, двое рабаўнікоў, пагражаючы пяром, пасьцялілі зь дзясятак зэбэсаўцаў і вынесьлі ўсю аргтэхніку. Пасьля чаго, паводле словаў кіраўніка ЗБС Крысьціны Сідун, яны дасюль заікаюцца й дзёргаюцца ў сутаргах. Сьмех дый толькі! Што рабіць, калі рабуюць, а мянты ня могуць абараніць? Раім усім энжэошнікам увесьці ў заяўку на грант адмысловы пункт у бюджэце: «Выдаткі на крышу». Тады вам ні тое што рабаўнікі, ніякія мянты ня страшныя.

Шлях да фэадалізму

Як вядома, у Беларусі існуе амаль дзясятак гістарычных клюбаў, якія ў экстазе спрабуюць рэстаўраваць элемэнты быту сярэднявечча: шыюць рыцарскія кальчугі, праводзяць турніры, сьпяваюць дамам сэрца міністрэльскія куплеты. Аднак усе гэтыя аматары даўніны смокчуць вялага ў звычайных працаўнікоў калгасу «Шлях да камунізму» Горыцкага раёну. Як піша *Гомельская Праўда*, на агульным зборы калгасьнікі прагаласавалі за ўваход усім калектывам у фэрмэрскую гаспадарку нейкага М.Шрубы. Як кажа сам фэрмэр, галоўным матывам людзей было тое, што людзі жадаюць працаваць і зарабляць грошы, а не цягнуць лямку ў калгасе. Па лёгіцы ў рукі Шрубы перайшлі ўсе рэсурсы калгасьнікаў, уключаючы агароды і дамы сялянаў. Сытуацыя поўнасцью адпавядае формуле фэадальнай вотчыны: сяляне-сьмерды могуць жыць у вёсцы толькі пры ўмове працы на фэадала. Рэкамэндуем калгасьнікам-мэдыявістам прадоўжыць фэадальны экспэрымэнт і ўвесьці на вёсцы права першай ночы. Саму ж лятыфундыю Шрубы можна назваць «Шлях да фэадалізму» ●

НазамЕтку КДБ

Як прадухіліць рост апазыцыйных настрояў у грамадзтве

Баранавіцкая газэта *Intex-Press* піша, што сьветлагорскія мянты знайшлі верны спосаб барацьбы з наркаманіяй: Вось што распавядае ў нумары за 7.02.02 кіраўнік аддзелу нораваў і барацьбы з нелегальным распаўсюджваньнем наркотыкаў Васіль Шух: «Сёньня асноўны сродак барацьбы з наркаманіяй - прафілактычная праца сярод моладзі. Як кажуць жыхары гораду, вялікае ўражаньне на іх аказалі тэлевізійныя праграмы, зьнятыя, як кажуць, з натуры. Напрыклад, інтэрвію з памяраючым наркаманам, або труп хлопца, які толькі што памёр ад перадазіроўкі. Яшчэ ў горадзе адчыненыя два пункты даверу, дзе наркаманы могуць памяняць выкарыстаныя шпрыцы на новыя.»

Гэты досьвед можа стацца карысным для ўладаў у рамках барацьбы з апазыцыяй. Варыянты розныя: інтэрвію са схуднелым ад хлебу й вады Шчукіным з Акрэсьцінскага карцэру, або расчленены труп Завадзкага. Усіх гэтых т.зв. апазыцыянэраў ахопіць такі жах, што большасьць маладафронтаўскіх жаўтароцікаў адразу кінуць дурноту ды ўвальюцца ў шэрагі будаўнікоў рынкавага сацыялізму.

СацыЯл

Выйсьце для беспрацоўных

Кратэрам злачыннасьці на крымінагеннай мапе краіны хуткім часам стане Лунінецкі раён Берасьцейшчыны. І вось чаму: у Лунінецкім раёне па афіцыйных дадзеных колькасьць беспрацоўных складае 7,8%. Таму тут прынялі праграму занятасьці.

Праграма, як піша *Брэсцкі кур'ер* (5, 2002) пераглядзіць калектыўныя дамовы ў кантэксце непазьбежных звальненьняў. У выпадку скарачэньняў пераважнае права застацца маюць шматдзетныя й адзінокія бацькі, якія выхоўваюць непаўнагадовых дзяцей, асобы пенсійнага ўзросту, воіны-інтэрнацыяналісты, інваліды, а таксама асобы, вызваленыя зь месцаў пазбаўленьня волі. Іншымі словамі, калі малады чалавек жадае перастрахавацца ад скарачэньняў, яму лепей за ўсё настрагаць дзяцей, або зрабіць адну-дзьве ходкі. Апошні варыянт больш прыярытэтны, чым першы: ня трэба шукаць цёлку, парыцца з арганізацыяй вясельля, працаваць начамі ў ложку, цацкацца з байструкамі, ды мыць пампэрсы. Проста сьпёр грошы ў суседа, прапіў – і ў турму. Адсядзеў, і адразу табе гарантаванае працоўнае месца.

Сусьветны гандлёвы лахатрон

Выйгрышныя сцэнары глябалізацыі для Беларусі

З пачатку-сярэдзіны лютага беларускі зьнешнеэканамічны вэктар вызначаецца жорсткай узбуджанасьцю. МУС краіны ганарліва заяўляе аб намеры афіцыйнага Менску ўвайсьці «паўнавартасным членам» у Сусьветную гандлёвую арганізацыю (WTO) не пазьней за 1 студзеня 2005 году. Эрагенны эфэкт рашэньня тлумачыцца магчымасьцямі, якія ўзгаданая структура абяцае падараваць краіне. Беларусь стала на хісткую гаць рынкавых рэформаў і сяброўства ў WTO тут – лакмусавая паперка і эбанітавая палачка разам узятыя. Атрымае Сінявокая кантрамарку ў імпартную абрэвіятуру – будзе лічыцца «краінай з адкрытай эканомікай», калі не – гніць ёй навечна ў саромнай гееньне «жорсткага пратэкцыянізму». Каманда Лукашэнкі ласа аблізвае вусы і вусікі: маўляў, нарэшце мы пакажам гэтым амэрыкосам і эўрапешкам, што адганяюць ад сваіх грэбаных рынкаў нашу прадукцыю.

Але адвіслую губу трэба было б трошкі скатаць назад. Лахатрон ён таму й лахатрон, што дэманструе наіўнаму калхазану ілюзію, што «ўсё чэсна, усё без абману, як у валшэбніка Сулеймана». Тое, што ўсе рашэньні на ўзроўні WTO прымаюцца кансэнсусам – казка для студэнтаў факультэту ЗПР эканамічнага ўнівэрсытэту і рэспубліканскай міжведамаснай камісіі па пытаньнях далучэньня Беларусі да WTO. На самой справе, большасьць бедных удзельнікаў галасуюць прыкладна як дэлегаты калгаснага сходу - альбо ня ведаючы за што, альбо пад прымусам. Бедным краінам найперш патрэбная валюта. Чым і карыстаюцца хітрыя дзядзькі з заходніх карпарацыяў.

Беларусі таксама кроў з горла патрэбныя новыя крыніцы валютнага хаўчыка. Вось і лезе дурніца бяз дуставага мыла ў WTO, марачы гэтым зьмесьці ўсе бар'еры для свайго экспарту. Для гэтага ёй спатрэбіцца ўсяго-нічога: спачатку самой адкрыць сваё дзявочае ўлоньне для замежных тавараў і паслугаў. Няцяжка зразумець, што для росту асобных экспартна пэрспэктыўных галінаў (калійныя ўгнаеньні, хімічная прамысловасьць, паслугі) трэба патапіць у фэкаліях усе

Чым можа пагражаць Беларусі ўступленьне ў Сусьветную Гандлёвую Арганізацыю?

астатнія, няздольныя канкураваць з таннай заморскай прадукцыяй. Але стаўкі на лахатроне ўжо зробленыя. У залежнасьці ад таго, на які пэрспэктыўны сэктар народнай гаспадаркі ўрад паставіў рэшткі эканамічнай незалежнасьці РБ, атрымайце адпаведны выйгрыш:

1. Генэралы калійных кар'ераў

Калійныя ўгнаеньні – і зараз галоўны артыкул беларускага экспарту. Салігорск 2005 году ўяўляецца прэм'еру Навіцкаму гэткім Эль-Кувэйтам з хмарачосамі на фоне кілямэтровых саляных гор і сотнямі ролсаў нованароджаных саляных шэйхаў. На самой справе, перафразуючы клясыка, «через четыре года здесь будет город-зад». Акрамя ператварэньня краіны ў сыравінны прыдатак заходніх тэстыкулаў, патрабаваная WTO «дэманапалізацыя» «Беларускалія» зь ягонай лягічнай прыватызацыяй расейскімі канкурэнтамі прывядзе да стварэньня горада-пустэльні з луннымі ляндшафтамі – шахцёрскага цэнтру, які працуе на ізнос сваіх магутнасьцяў.

2. Хімічнае эльдарада

Зайздросная пэрспэктыва. Калі скончыцца апартэід беларускай прадукцыі на Захадзе, хімічныя валокны канцэрну «Белнефтехим» патэнцыйна змогуць прыносіць столькі валюты, што падавімся. Але ўмова тая ж – дэманапалізацыя і дапушчэньне замежных інвэстараў на рынак, што, дарэчы, ўжо пачынаецца. Па заходняй тэндэнцыі да вывазу ў краіны Трэцяга Сьвету брудная вытворчасьці, у 2005 годзе Беларусь зможа атрымаць у дадатак да чарнобыльскай славы ганаровы тытул «ванючкі Эўропы». Але валюта не сьмярдзіць, асабліва калі ты ў працівагазе.

3. «Самая адукаваная нацыя»

«Рынак» адукацыі – самы пэрспэктыўны ў сьвеце (2 000 млрд. даляраў). Наш адукаваны край, на першы погляд, мае тут надзвычай добрую патэнцыю. Асабліва на рынках Трэцяга Сьвету. Але WTO не задавальняе дзяржаўная манаполія і адсутнасьць канкурэнцыі якраз на рынку нашых паслугаў. Праўда, пакуль што Арганізацыя нас папракае толькі сувязьзю, страхаваньнем і банкамі, але ня трэба забывацца, што Агульная дамова аб гандлі паслугамі (GATS, 1994) прадугледжвае наступную умову: «роўныя правы ў канкурэнцыі для дзяржаўнага і прыватнага, нацыянальнага і замежнага інвэстара», што запатрабуе спыненьня дзяржаўнай падтрымкі існуючых дзяржунівэраў. Да пабачэньня, бясплатнае навучаньне, нерэнтабельныя беларусазнаўства, гісторыя і культуралёгія. Прывітаньне, засільле элітных установаў, менэджмэнту і адміністраваньня, інфарматыкі, дыстанцыйнага навучаньня і разнастайных інтэнсіўных курсаў ●

Мішэль Камдэсю

Рэкляма ў газэце
НАВІНКІ
1см² – 1200 бел. руб.
(разам з ПДВ)
Зьвязвацца праз пэйджэр: 2070000 аб.16816

Двухбаковы мараторы



Рух ЗУБР, вядомы сваімі перадвыбарнымі палітычнымі рухамі, распачынае сацыяльную акцыю. У пад'ездах некаторых дамоў ужо зьявіліся ўлёткі за подпісам Зубра, у якіх напісана, што калі ў пад'езьдзе выбітая лямпачка, у кватэрах няма цяпла ці гарачай вады, трэба зьвяртацца ў ЖЭС. У сваю чаргу, зубры гарантуюць, што больш ня будуць крэмзаць на сьценах свае надпісы й паганіць такім чынам фасады дамоў. Маўляў, хай лепей ЖЭС пусьціць грошы не на замазваньне апазыцыйных шэдэўраў, а на добраўпарадкаваньне жыльля. Невядома колькі працягнецца гэты своеасаблівы мараторый, але ж лямпачак як не было, так, напэўна, і ня будзе. Лепей замест гучных заяваў справай заняліся б ●

Чарнільнае «лобі»

Прыватызацыі «Крыніцы» супрацьстаіць «чарнільная» мафія

Уявіце сабе пачуцьці прэзыдэнта піўной кампаніі «Балтика» Таймураза Балоева, калі Галоўны півавар Беларусі замарозіў праект па продажы яму «Крыніцы». «Кінулі як апошняга лашка!» – падумаў паўночны інвэстар. І яго можна зразумець. «Балтика» ўклала ў «Крыніцу» больш за 10 мільёнаў барыкаў, а тут – як сярпом па дзетародных органах. Цікава, аднак, што кіраўніцтва квазі-піцерскага бровару ў асобе ягонага віцэ-прэзыдэнта Адама Тлехурая абвінаваціла ў кідалаве не гаранта нацыянальных інтарэсаў (А.Р. Лукашэнку, як заўсёды, «дэзынфармавалі»), а «гарэлачнае лобі», якое быццам бы зацікаўленае ў тым, «каб беларуская піўная галіна не адраджалася» (*БР*, №6/2002).

Сапраўды, некаторым можа падацца, што дырэктары «Крышталю» і Берасьцейскага лікёра-гарэлачнага маюць сур'ёзныя намеры непрыкметнай канвэрсіі піўзаводаў спачатку на вытворчасьць «ёршаў» (да якіх ад сучасных «моцных» гатункаў піва рукой падаць), а потым і на больш салідную гарачыцельную прадукцыю. У гэткім выпадку заняпад беларускага піваварэньня павінен быць прама прапарцыйны росту продажаў гарэлак і горкіх настоек. Але вось казус: у апошнія гады спажываньне гарэлкі беларускім кансуматарам скарачаецца проста катастрафічнымі тэмпамі.

Што сапраўды расьце, дык гэта прыём унутар пладова-хімікатных кактэйляў гатунку «чарніла». Таму «Балтике» варта было б задацца іншым пытаньнем: ці не існуе ў РБ магутнага «чарнільнага лобі», зацікаўленага ў пашырэньні абаротаў продажу танных вінных напояў – рэальных канкурэнтаў як піва, гэтак і гарэлкі? Бо ж на вытворчасьць «чарнілаў» арыентуюцца ня толькі гарэлачныя монстры, але й самі беларускія півавары ня супраць дадаць да свайго асартымэнту штосьці алькагольна-фруктовае. Прыкладам можа паслужыць выпуск «Крыніцай» мацаванага віна «Лори красное» – сапраўднага траянскага каня ў сэрцы піўной індустрыі. Калі такая тэндэнцыя захаваецца, то неўзабаве трэба чакаць зьяўленьня «Крыжачку» ці «Загадкі» крынічнага разьліву. А вы ўсё пра піва, спадар Балоеў ●

Іван Таранаў

ДМБ 2002

100 дней да

Калі разглядаць грамадзтва як вайсковую казарму, то адпаведна няўстаўным раскладам, армія – гэта дух бясплотны (самы забіты салдат). Дух пухне з голаду, яго трасуць на бабло, прымушаюць гуталініць асфальт і вазяліць трамвайную рэйку. І новы Закон аб вайсковай павіннасьці, які неўзабаве будзе падпісаны Прэзыдэнтам, наўрад ці выправіць гэтую сытуацыю: духі будуць фарбаваць траву да 31 году (новая мяжа прызыўнога ўзросту 32 гады), але ўсяго толькі паўгады (новы максымальны тэрмін службы1 год).

Гэта ня першая вайсковая рэформа ў краіне. Першая адбылася ў часы дагістарычнага матэрыялізму. Неяк прашчуры крывічоў у пошуках галюцынагенных клубняў заблукалі на тэрыторыю сучаснай РБ. Тут пасьвіліся прадстаўнікі культуры шнуравой керамікі, якія не пажадалі дзяліцца шампіньёнамі з чужынцамі. Каб прысвоіць алкалоід, прыйшлося стварыць племянную вайсковую арганізацыю, інакш кажучы – армію. Праходжаньне вайсковай камісіі заняла тады лічаныя сэкунды.

Аднак і ў тыя далёкія часы прызыўнік, як і сёньня, любіў прыкінуцца хворым: «Мне ў войска нельга. У мяне дзіцячы цэрэбральны параліч. Калі ласка, даведка ад аблведзьмака. Вось яшчэ выпіска з дэканату, маю права на адтэрміноўку як студэнт факультэту права першай ночы Крывіцкага Незалежнага Гуманітарнага Універсытэта».

На ўсе гэтыя аргумэнты ваенкам меў свой: «У мяне таксама падучая, аднак я ж служыў. Адпаведна закону аб вайсковым абавязку першабытнага племені ў войску павінны служыць усе асобы мужчынскага полу. Паколькі ў вас няма жаночых полавых прызнакаў – вульвы і малочных залозаў, вы – мужчына, так што стаўлю вам «годны». Можаш суцешыць сябе, сынок, тым, што табе забясьпечаная бліскучая вайсковая кар'ера. Паколькі ўсе пытаньні вырашаюцца на агульным сходзе, у нас няма шарагоўцаў. Так што, віншую з зоркай генэралісімуса.

Другую вайсковую рэформу ў Беларусі правярнулі на пачатку IX стагодзьдзя. Было створанае першае прафэсійнае войска. Рэформа вельмі моцна ўдарыла па тагачасных бэнээхваўцах, якія штурмавалі ваенкаматы ў патрыятычнай ломцы... «Вам чаго трэба, малады чалавек?» – пытаў ваенкам. «Вось... Жадаю прынесьці сьвяшчэнны доўг роднаму Полацкаму княству, над якім навісла пагроза кіеўскай калянізацыі. Трэба начысьціць пысу імпэрыялістам Рурыкавічам. Усе на фронт! Усё для перамогі! Нацыя або сьмерць!»

У ваенкама ад такіх прамоваў ехаў дах: «Вы, бачу,... шыз, які дасюль ня ведае, што ў войску служаць выключна дзеля павагі сэньёру і грошай. Якая Радзіма! Якая Нацыя! Гэты ,тэрмін прыдумаюць толькі праз восем-дзевяць стагодзьдзяў. Прынцып фэадальнай арміі наступны: армія складаецца з дружыньнікаў (пазьней – шляхцічаў), якім князь за службу дае грошы або зямельны надзел з халопамі».

Патрыёт выходзіў з ваенкамату, быццам яго адымелі.

Прыкладна з XIX стагодзьдзя, пасьля таго як невядомы гісторыі абдалбаны кітаец выдаў эўрапейцам сакрэт выраблення пораху, каціроўкі шляхецкай коньніцы сталі падаць. Прыйшлося праводзіць чарговую рэформу. Месца коньнікаў заняла пяхота, якая складался з рэкрутаў. Рэкруцкія наборы нагадвалі атракцыён «Рускае лато». Ваенкам, надрываючы глотку, бадзяўся з лататронам па сваім участку: «Рабіце стаўкі спадары прызыўнікі. Той на каго ўкажа сьляпы лёс, адправіцца змагацца за свайго караля (цара, імпэратара, курфюрста і іншую аўгусьцейшую асобу). Астатнія могуць лічыць, што ў іх

Дзембельскі альбом Віктара Паўлючэнкі, кантрактніка 1-й брыгады спэцназу УС РБ.

Дзембельскі альбом Вавы Ахтунг, радавога гвардзейскай дывізіі альтэрнатыўных войскаў РБ.



ДМБ 2002

ПРЫКАЗА

Дзембельскі альбом дзеда Талаша, байца народнага апалчэньня Лунінецкай акругі.

Дзембельскі альбом Аляксандра Яна Стральцова-Карвацкага, капрала пацешных войскаў ВКЛ.

ваенныя білеты». Прызыўнікі падыходзілі і кідалі ў шапку паперкі з сваім імем. Потым цягнулі і вызначалі «слабое зьвяно» – шчасьліўчыка, які сыходзіў у войска. Паколькі тэрмін службы цягнуўся аж 25 гадоў і больш, дэмбеляў у сучасным сэнсе слова амаль не было. У дзень кірасіра або грэнадзёра валасатыя панкі спакойна хадзілі па вуліцах. Нешматлікія ДМБ уяўлялі сабой калекаў нулёвай інваліднай групы. Таму іх фразы кшталту «Вы ў якім палку служылі» выклікалі хутчэй выбух жалобы, чым прыступ жаху.

На пачатку 19 стагодзьдзя ўзьніклі дзяржавы-нацыі. У вайскоўцах раптам прызналі не гвалтаўнікоў, наёмнікаў і марадзёраў, а бравых сыноў айчыны. Апэратыўна правялі вайсковую рэформу. Служыць цяпер быў павінен кожны грамадзянін, натуральна калі ён ня мае адтэрміноўкі, белага білета і не падмазаў чыноўніка. У 1874 годзе Аляксандар III абвесьціў аб пераходзе на агульны набор. Гэтак, царскае правіла агульнага вайсковага абавязку прыйшло ў Беларусь і зь невялікімі інтэрлюдыямі дзейнічае дасюль. Пра перапынкі ў дзеяньні закону аб усеагульным вайсковым абавязку трэба сказаць асобна. У 1917 армія стала абсалютна добраахвотнай. Тагачасная *Во славу Родины* пісала, што «вышэйшы прынцып служэньня Радзіме – гэта ўвогуле не служыць, бо Радзіма – гэта байка буржуазнай прапаганды. У пралетарыя няма Радзімы. Пралетарыі ўсіх краін, касіце!». Паколькі традыцыйна лічылася, што мужык, які не пабываў у войску – не мужык, а пядрылка, гопнікам прыходзілася выдумываць сабе эрзацы арміяў. Так узьнікалі банды з гучнымі імёнамі: армія Беларускай Народнай Рэспублікі, «Зялёны Дуб», дывізія атамана Грыцыяна-Таўрычаскага, «Чырвоная Армія», Добраахвотніцкая і інш.

Яшчэ больш экзатычнай была сытуацыя падчас акупацыі. Гэта быў зорны час беларускай альтэрнатыўнай службы. Немцы лічылі, што беларусы настолькі расава апушчаныя, што ім ня тое, што аўтаномію – дубальтоўку даверыць нельга. Замест вайсковых частак кшталту дывізіі Галычына СС, або ўласаўскай РОА, была створаная Беларуская Краёвая Самаабарона – сумесь «стройбата» і альтэрнатыўнай службы. Адзінае адрозьненьне ад сёньняшніх альтэрнатыўшчыкаў было ў тым, што зараз, каб законна не пайсьці ў войска, трэба быць гомікам, рэцыдывістам, або злосным сэктантам, напрыклад, сьведкам Яговы.

У часы другой сусьветнай быў патрэбны іншы дыягназ: трэба было верыць, што ў гітлераўскай Эўропе беларусы атрымаюць самастойнасьць. Але альтэрнатыўшчыкаў у той час не любілі: тыя, хто не хацеў махаць рыдлёўкай на Фрыца, йшлі да партызанаў.

Сёньня армія нікому не патрэбная. Дзякуючы глябалізацыі, акупаваць краіны стала бессэнсоўна. Прасьцей скупіць яе эканоміку пад сьцягам інвэстыцыяў. Відавочна, што галоўны вораг не за мяжой, а ўнутры краіны – апазыцыянэры, забастоўшчыкі, журналісты. У рэйнджэраў з МУСу за годы існаваньня РБ не было ні воднай хвілінкі адпачынку.

А што зрабілі хлопцы ў гэты час у форме хакі? На свой рахунак салдафоны могуць запісаць толькі адзін зьбіты паветраны шар амэрыканскіх гандальераў. Ці трэба было дзеля агромнага прэзэрватыва штогод траціць амаль 5-6% бюджэту? Такім чынам, сёньняшнія армія – інстытут у нашым грамадзтве чыста сымбалічны.

І ёсьць сэнс разгледзець розныя варыянты мадэлі роднага войска і выбраць лепшы, калі ён існуе

НАшыя чытАнкі

Літаратурныя полюсы

ARCHE «Украінскі нумар»

Arche – адно зь нешматлікіх выданьняў, якія не патрабуюць прэзэнтацыяў з блявоцінай і мастурбацыямі. Ідэя ўкраінскага нумару заключалася ў тым, каб разбурыць беларускія стэрэатыпы стасоўна Ўкраіны: голад, холад, сала, хахлы, Шаўчэнка (не паэт, а футбаліст). На думку рэдактара часопісу А.Дынька, пры слове Ўкраіна ў беларусаў павінна ўзьнікаць уяўленьне краіны, якая мае моцны культурны сувэрэнітэт. Нумар атрымаўся амаль неблагі, відаць, таму, што не было традыцыйных Глёбуса і Адамовіча. Нарэшце ў *Arche* патлумачылі чытачам, хто такія ўсходнеэўрапейскія крэолы (у вэрсіі Міколы Рабчука і Сяргея Грабоўскага, а не Валеркі Булгакава), падалі яшчэ адну вэрсію перакладу раману *Палявых дасьледаваньняў украінскага сэксу* Аксаны Забужкі – амаль адначасова выходзіць пераклад у *Крыніцы*, безумоўна каштоўны досьвед, таксама як і *Маскавіяда* Юрыя Андруховіча.

Між тым, застаецца ўражаньне пэўнай тэндэнцыйнасьці ў падборцы аўтараў хаця нумар і досыць вялікі па аб'ёму, матэрыялы нейкія аднастайныя і наўрад ці здольныя даць поўную карціну ўкраінскай рэчаіснасьці. На нашу думку сучасную ўкраінскую літаратуру цяжка ўявіць без Лэся Падэрв'янскага, аўтара шматлікіх драматычных і эпічных паэмаў (ягоны сайт – ultima. te можна прачытаць праз I-net):

Люди, люди, ці дурні козли!
Як остопи...дили мені містичні бл...ді,
Обвішані восточною х...нею,
Що перед тим як взяти х...й у рота
Повинні привести себе у резонанс
З зефіром світовим. Кістляві атеїстки,
Що лекції читають кугутам про Марс і
їншу поє...єнь,
А кугути є...уть їх довгими сумними
вечорами
Десь під коморою, а та тіки сопить.

(Лэсь Падэрв'янскі, «Паўлік Марозаў») На заканчэньне пра разбурэньне стэрэатыпаў. Рэдакцыя *Навінак* правяла невялікі экспэрымэнт: дала групе супрацоўнікаў прачытаць украінскі *Arche* і пасьля апыталі іх, якія зараз асацыяцыі ў іх выклікае слова Ўкраіна. Адказы наступныя: хахлы, сала, холад, голад, Шэўчэнка (не паэт, а футбаліст).



Сельское кладбище № 17

Чарговы нумар самаробнага часопісу *СК* прысьвечаны асобе вядомага ў шырокіх калялітаратурных колах калялітаратара Сяргея Патаранскага. Уражвае сваімі маштабамі «бібліяграфія» – сьпіс публікацыяў, якімі апошнія дзесяць год літаральна бамбардаваў розныя літаратурныя выданьні Патаранскі, яўна цягне на кнігу рэкордаў Гінэса. Мэта нумару – зрабіць недвухсэнсоўную пародыю на «афіцыйныя» выданьні, накшталт *ЛіМу* і *Крыніцы* з постацямі літаратурных генэралаў, дзе праз падмену сур'ёзнага пісьменьніка гарохавым блазнам дасягаецца эфэкт дэмістыфікацыі ролі мастака ў грамадзтве і Саюзу Пісьменьнікаў, у які ўжо восьмы раз за мінулыя пяць год падаваў заяву Патаранскі. Зь іншага боку – праслаўляць самыя нікчэмныя тэмы, як напрыклад дэфэкацыя і нецэнзурная лаянка, выдаўцы *СК* лічаць сваёй літаратурнай задачай, постмадэрнісцкім мэтадам і творчым крэдам. Такім чынам, яны трапляюць у сытуацыю, скажам, падвойную – калі напісаць пра маніякальнага графамана, што ён, напрыклад, «трапіў пад каня на вуліцы» – той усё адно будзе скакаць ад радасьці – яшчэ адна публікацыя пра мяне! ●

Зьміцер Серабракоў



19.02 АДБЫЛАСЯ ПРЭЗЭНТАЦЫЯ ПРАЕКТУ

СВАБОДА@БЕЗ.ЦЯБЕ

КРАЯВІДЫ НА ВОЛЬНЫМ ПАВЕТРЫ

Прапануем Вашай увазе зборнік тэкстаў, прысьвечаных сацыяльнага, культурнага й мастацкаму супраціву.

У межах праекту прапануем таксама відэафільмы:
1. Шостае сонца. Паўстаньне індзейцаў майя ў Чыяпасе.
2. Маёр або рэвалюцыя гномікаў. Памаранчовая Альтэрнатыва.
3. Бялградзкі марш: «84 дні хаджэньня», «Студзеньская рака», «Гукі Сэрбіі».

Цікаўных просім зьвяртацца праз мэйл: PAULUK@TUT.BY

Не пакідайце ж мовы нашай.., маць вашу!

У гэтым годзе абрынуўся апошні бастыён нецэнзуршчыны ў Расеі. Маднявы часопіс *Афиша* й салідная газэта *Известия* прызналі Сяргея Шнурава, вакаліста гурту ЛЕНИНГРАД чалавекам году. Як сьледзтва, Дзіброў запрасіў галоўных мацяршчыньнікаў Расеі на сваё шоў. Гурт грае ў самых крутых канцэртных залях, а песьні кшталту «пабрэй пі...ду, с...ка ё...аная на ...уй ...ляць!» або «А я вот дзень раждзенье ня буду спраўляць! Усё зая...ала пі...дзец на ...уй ...ляць!» гучаць у тых самых палацах зьездаў, што яшчэ пасьпелі астынуць ад аплядысмэнтаў Мусьліму Магамаеву й Філіпу Кіркораву.

Падзея ў нейкім сэнсе знакавая як для мясцовай поп-сцэны, гэтак і для ўсёй постсавецкай культуры ўцэлым. Да 90-х у Расеі мат займаў сваю традыцыйна маргінальную нішу ў кабаках, піўнухах ды альтэрнатыўна-падвальнай антысавецка-эстэцкай культуры, а ягонымі мэтрамі лічыліся падвальныя гурты ГРАЖДАНСКАЯ ОБОРОНА, СЕКТОР ГАЗА, Лаэрцкі і Х..Й ЗАБЕЙ, паэт Баркоў, этнограф Афанасьеў і іншыя клясыкі прытонаў. Але большая частка з гэтых сучасных музыкаў-мацюгальнікаў пасьля выхаду з падвалу пазьбягалі ўжываньня мату, маўляў, «фі, эта некультурна...» Той жа Найк Барзоў з ХЗ зараз сьпявае: «Я маленькая лашадка» замест ранейшага «Пушка здохла ўсё пі...дец, большэ нечэва тут ..бацца». Аднак ужо з пачатку 90-х частка контаркультурнай эліты, пачынае ўголас размаўляць пра праблему расейскага мату. В.Ерафееў выдае анталёгію расейскай парнаграфічнай казкі, В.Сарокін упрысківае мат у сваю творчасьць, нават па тэлеканалу «Культура» ідзе перадача, прысьвечаная эстэтыцы мату. Аднак мат як зьява ўсё адно заставаўся на пэрыфэрыі «легальнай» мас-культуры. І тут – сапраўдны мацюгальны пераварот, прадказаць наступствы якога даволі проста. Прыкладам можа паслужыць братняя Польшча, дзе эмансыпацыя родных нам «трох акордаў» (Х, П, Е) адбылася нашмат раней, і цяпер даўно ўжо нічога не перашкаджае Вэлэнсе абкласьці прэзыдэнта Квасьнеўскага адборным славянскім трохпавярховікам у прамым эфіры, а цэнтральным газэтам без праблемаў гэта перадрукаваць. Пройдзе яшчэ некалькі гадоў, і ў Расеі мат згубіць сваю сутнасьць. Ён згубіцца ў нарматыўнай, лексыцы, апапсее, страціць сваю псэўда-контаркультурнасьць, і слова ...уй, нічым ня будзе адрозьнівацца ад слова лямпачка. Тады ўжо і па БТ будуць выступаць Алеся й Анатоль Ярмолянкі зь песьняй «Гей, жыць не ўміраць. Гей, ..б тваю маць!» ●

«Небясьпечная сытуацыя! Гол! ...Уй! Штанга!» Такога кшталту спартовыя камэнтары хутка будуць не ў навінку.

Андрусь Дынько,
ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР ГАЗЭТЫ
Наша Ніва

Хашчавацкі: праваслаўе і камунізм

У Бэрліне скончылася гэтак званая «бэрлінале». Дасьведчаныя людзі бачылі там жонку вядомага стваральніка гомааповядаў Глёбуса Ленку Адамчык (па маці Бяляева) з выставай у кампаніі вядучага праграмы «Новая КаМПлекцыя» Алега Лукашэвіча. Той прадставіў на суд публікі новую сваю стужку «Лена Адамчык – беларуская гей-ікона». Лена вельмі любіць геяў, а нядаўна ўзначаліла бабскі сайт лезьбі.бай. Карцінак Ленка прадставіла роўна чатыры. Гэтым разам беларускім сынэматаграфістам аніводнага залатога мядзьведзіка не дасталося. Мінулым летам Юрка Хашчавацкі адпомсьціў немцам разам з праваслаўнаю кірхай у купе. Усім давёў у сваёй новай карціне, што камунізм і праваслаўная грамадзкая арганізацыя з назвай РПЦ – адзін чорт. Магу адназначна сьцьвярджаць, што калі дзядзька Алексій з Маскоўскай патрыярхіі не загадае сваім мулярам маляваць з Хашчавацкага д'яблаў, дык я перастану біць па клявішам, а Ленку не прызнаюць гей-іконай. А на кіно трэба зірнуць. Во! Бо як тады апраўдаць Сымона Буднага зь яго: «У пекла йсьці ня бойся, там сустрэнеш многа сяброў!» Да сустрэчы, Юрка ды Ленка! ●

Жазысын Бздын

ПрызЁр фЭсту!

Navinki Home Video прэдстаўляют СЛУЧАЙ З ПАЦАНОМ.

Юра, нармальны пацан з раёна, сорыцца са сваёй малой. У поіске душэўнага спакойствія он рашает устроіцца как усе на работу. Аднака на пуці Юры вазьнікает прэкрасная незнакомка Насьця, акцівістка адной зь дземакрацічэскіх арганізацый. Юра ўзнает, што ў стране сушчэствует какая-та апазіцыя, каторая борэцца з какой-та там дзіктатурай. Сам таго ня зная, глаўны герой пападает у самую гушчу паліцічэскіх інтрыг...

Усім, хто жадае набыць фільм на відэакасэце, просьба зьвяртацца праз нашыя кантакты:

Пэйджэр: 2070000, аб. 4116
Адрас: 220134, Менск, п/с 33
E-mail: maryska@tut.by

СЬПЯШАЙЦЕСЯ!

Гэта ня фэстываль супрацьпатарскага кіно!

Кодэкс сапраўднага ліцьвіна

Новы твор АМальдзіса як падручнік для настальгістаў па ВКЛ

Сьвежанадрукаваны фаліянт Адама Мальдзіса *Як жылі нашы продкі ў XVIII стагодзьдзі* (Менск, «Лімарыус», 2001) зойме самы ганаровы пасад на паліцах бібліятэкі беларускага нацыяналіста. Гэта болей чым гістарычная манаграфія. Гэта гід па будзённым жыцьці для нацыяналіста-чайніка, які даўно марыў разарваць з бэсэсэраўскім быдлам і забацацца рыцарам ВКЛ. Дзякуючы прафэсару Мальдзісу мы ведаем, як павінен паводзіць сябе сапраўдны грамадзянін ВКЛ. Напрыклад, (**мал.1**) сапраўднага ліцьвіна ад саўка лёгка адрозьнівае здаровы рэлігійны фанатызм. Як піша Мальдзіс, найбольш фанатычныя каталікі ў малітве даходзілі да лютасьці: біліся галовамі аб сьцены і падлогу, абменьваліся аплявухамі, самабічаваліся крапівой, секлі сябе рамянямі, да канцоў якіх былі прымацаваныя – для рваньня цела – мэталічныя зоркі. Вядома ж, гэта балюча, аднак што рабіць: назваўся ліцьвінам – атрымай аплявуху.

Яшчэ адной характэрнай рысай тагачасных ліцьвінаў зьяўляецца забабоннасьць. Нармалёвы ліцьвін павінен сьлепа верыць у монстраў, крывасмокаў і змагацца з прывідамі. Для гэтага трэба (**мал.2**), не марнуючы часу, узяць рыдлёўку і капаць сьвежыя магілы, падазраваных у сувязі зь Люцыпарам. Нябожчыку адсячыце башку, накарміце вусны сьвінячым калам, або выпіце ягоную кроў. Зрабіўшы гэта можаце лічыць сябе 100% ліцьвінам. Увогуле, ліцьвінам быць файна. Як піша Мальдзіс, сапраўдны грамадзянін ВКЛ павінен заўсёды балавацца амаралкай, кіраць, адным словам, грашыць, бо бяз гэтага немагчыма пакаяцца. Рэкамэндуем трыдыцыйны прыкол сярэднявечных прашчураў: падкаравуліць каля ліфту суседа, пырнуць яго хлебарэзам, а потым доўга рыдаць над ягоным нежывым трупам. Таму калі пабачыце на вуліцы дзецюка, што б'ецца галавой аб сьцену, цягне куды-небудзь труп або бегае за пешаходамі з кінжалам, не палохайцеся: гэта рыцар Вялікага Княства Літоўскага ●

Станіслаў Панятоўскі

ДОшка аб Яваў

Праводзіцца конкурс паэцічэскіх праізьведзеній (прэдпачціцельна малай формы) на саўрыменнам беларускам езыке – сьпяцальный прыз ат Обшчыства зашчыты саўрыменнага б.е. Шліце сваі шэдэўры yelrihs@rambler.ru

23 мая адбудзецца прэзэнтацыя літаратурна-філязафічнага часопісу *Паміж*, якая пройдзе ў залі бібліятэкі імя Я.Купалы. Пачатак у 18^{30}.

Газэта «Навінкі» прымае ў падарунак старыя часопісы. Будзем вельмі ўдзячныя. Рэдакцыя.

Тэрмінова куплю (або здыму на працяглы тэрмін) дом у Менску (прыватны сэктар) з усімі камунікацыямі, нядорага. Зьвязвацца праз тэл. 2823650.

Умовы разьмяшчэньня абвесткі ў газэце

Пералічыце 400 рублёў праз пошту пераводам на разліковы рахунак рэдакцыі: рэдакцыя газэты «Навінкі», р/р 3012201400013, Купалаўскае аддзяленьне ОАО «БелінвестБанк», г.Менск, код 481. На зваротным баку блянку паштовага пераводу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запішыце дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадайце сказ: «За рэклямныя паслугі».

СпОрт

Беларусы падмачылі

Фатальным для кіраўніцтва беларускай алімпійскай зборнай аказаўся скандал, што ўспыхнуў вакол віцяблянкі Юлія Паўловіч, якая выступае ў шорт-трэку. Дзяўчына папалася на прозе: у яе аналізах знайшлі нейкую хімію, што прывяло да дэпартацыі шэфа беларускай алімпійскай місіі Яраслава Барычкі, а НАК Беларусі пазбаўлены грантаў.

Сама ж спартсменка клянецца, што ніколі не ўжывала анаболікаў. Проста перад стартам яна адчувала сябе дрэнна, і ў крытычнай сытуацыі знаёмы балгарскі лекар зрабіў ёй абязбольваючы ўкол. Напрошваюцца некалькі вэрсіяў гэтай падзеі.

1. Усё гэта амэрыканская змова супраць Беларусі. Дарэчы тут будзе ўспомніць і нядаўні скандал з харчаваньнем нашых алімпійцаў. Не змаглі замарыць голадам—зловім на хіміі!

2. Балгарская змова. Чаму ін'екцыю зрабіў менавіта балгарскі лекар? Адразу прыходзіць на памяць 1996 год, калі ў Сафіі мясцовы АМАП уваліў дубінкамі нашым хакеістам па самыя таматы.

3. Знойдзеная хімія ёсьць нішто іншае, як гармон 19norandronsterone, які ўласьцівы толькі мужчынам. Яго канцэнтрацыя ў аналізах перавысіла норму ў 380! разоў. Калі беларуска не ўжывала допінг, то яна альбо мужык, альбо транссэксуал.

Атрымоўваецца, што МАК не паважае правоў сэксуальных меншасьцяў.

Каму верыць—невядома. Вядома толькі, што айчыннаму спартоваму ведамству не пазьбегнуць гучных адставак і чысткі кадраў ●

Яніна Карольчык

СьнэмА

«Кубанскія казакі» па-беларуску

«Сьвежына з салютам» – гэтак называецца новая карціна «Беларусьфільму» пра калгасьнікаў. Больш антысялянскага твору прыдумаць было цяжка. Стужка паказвае побыт сучасных беларускіх сялянаў як нейкі казачны курорт. Айчынныя «пэйзане» сьпяць, бухаюць, могуць дазволіць сабе хадзіць на фэрму ў шыкоўных футрах, на сьвята замовіць фэєрвэрк з салютам крамлёўскага маштабу. Глядзіш на іх жыцьцё і думаеш: на які ляд аграрыям штогод такія агромныя крэдыты даюць?! Яны ж як каты ў масьле катаюцца! Каб выратаваць крэдытныя прывілеі аграпрамысловае лобі павінна дабівацца забароны паказу карціны. Рэкамэндуем падключыць кашэрна-сэміцкую грамадзкасьць ды вэгетарыянцаў, якім дакладна не спадабаецца сюжэт «Сьвежыны з салютам»: двое напаўцьвярозых «крастоў» ганяюцца за парсюком, каб забіць жывёлу ды нарабіць зь яго шкварак пад чарку. На заканчэньне хочацца заўважыць, што ўсе пэрсанажы(нават мянты!) размаўляюць на чысьцюткай матчынай мове.

РЭКЛЯМА

Тушаная валянцінка

Пакуль 14 лютага на Дзень закаханых маладафронтаўскія актывісты бадзяліся па сталіцы, раздаючы спалоханым мінакам бел-чырвона-белыя сэрцы й спадзеючыся атрымаць сьвяточных батагоў ад органаў правапарадку, сапраўды ўрачысты і карысны падарунак зрабіў для пакупнікоў Слуцкі мясакамбінат. Ён таксама вырабіў валянцінку. Слуцкае «Сэрца тушанае па-хатняму», якое зьявілася на паліцах сталічных крамаў акурат пад сьвята, задаволіла ня толькі пахатлівыя пачуцьці пакупніка, але й больш празаічнае жаданьне набіць сваю ўтробу нечым емным. Адпаведна, слуцкія мясаробы заўважна папоўнілі сваю касу. Спадзяемся, што хуліганам з МФ хопіць часу на Акрэсьціна, каб зрабіць высновы з гэтага факту. Напрыклад, у наступны Дзень сьвятога Валянціна раздаваць мінакам не картонныя самаробныя чырвовыя масьці банальных нацыянальных колераў, а прынамсі заказаць у бабулек «пеўнікаў» на палачках у форме сэрца. І грошы ў Севярынца зьявяцца, каб аплочваць чарговыя штрафы ●

Цікава, чым парадуюць слуцкія мясаробы жанчын на 8 сакавіка. Можа, «сасіскі любімага»?..

Тор-7 падзеяў лютага ў сьвеце



1 На першым месцы доўгачаканы альбом выканаўцы балканскага панк-фольку Слабадана Мілошавіча «Суд у Гаазе». Суайчыньнік Кустурыцы йшоў да гэтага трыюмфу вельмі доўга. Першы трэк быў запісаны ў далёкім 1991 годзе. Ён называўся «Інтэрвэнцыя Югаслаўскага войска ў Славенію і Харватыю». Гэта быў досыць неблагі пачатак для рок-нэафіту. У сярэдзіне 90-ых пасьля акліматызацыі на сцэне Слоба стрэліў шэрагам больш моцных CDs: «Генацыд у Босьніі»; «Расавая чыстка ў Сэрбніцы». А «Масакра ў Косава» (1998) стала шэдэўрам сучаснага бруталу. Эўрапейскія прад'юсары даўно намагаліся зацягнуць панка ў Гаагу. І толькі зараз ён трапіў у залю славы вядомага гаагскага рок-клюбу «Трыбунал па правах чалавека». Калі яго ацэніць гаагская прад'юсарская тусоўка, то Слобу чакае пажыцьцёвы кантракт зь мясцовым клюбам «Камэра для злачынцаў супраць чалавецтва».

2 Паступіў у продаж і адразу замацаваўся на другім месцы альбом дуэту Шарон-Арафат «Пятая араба-ізраільская вайна». Пасьля 22-гадовага маўчаньня араба-ізраільскі тандэм выдаў сур'ёзную заяўку на тое, каб зрабіць згаданую кампіляцыю падзеяй году. Найбольш моцныя сынглы ў альбоме: «Ракетны абстрэл Рамалаха», «Забойства арабскага падлетка ізраільскім салдатам» і інш. Альбом расьсьцілае перад ашалелымі слухачамі пэйзажы араба-ізраільскай бойні, намаляваныя акуратнымі мазкамі вакалу арабскіх уцекачоў і прыслушаных сэмплаў ахвяраў ісламскіх камікадзе. На радасьць прыхільнікаў старога шаронаўскага голасу ў якасьці бонус-трэку на дыску прысутнічае тэхна-рэмікс на стары хіт Шарона «Разьня палестынцаў у лягеры Сабра і Шаціла». Песьня была бэстсэлерам у папярэднім альбоме калектыву «Ліванскі канфлікт».

3 На ганаровым трэцім месцы Буш-малодшы. У мінулым годзе менавіта ён атрымаў Грэмі ў катэгорыі «Самы брутальны альбом». 29 студзеня ў бары «Капіталійская блявоціна» пэрспэктыўны падлетак абвесьціў пра хуткі выхад новага блокбастэру «Барацьба з восьсю зла». Асноўнымі кампазыцыямі новага вінілу павінны былі стаць наступныя: «Інтэрвэнцыя ў Ірак», «Атака на Іран» і «Вайна з Паўночнай Карэяй». Аднак апошнія гастролі Буша ў Азіі прадэманстравалі, што, магчыма, ад ваяўнічага драйву былога Буша-маладога не застанецца нічога. Паўднёвакарэйскія маралісты-канфуцыянцы знайшлі дэцыбэлы й енкі маладога рокера вельмі жорсткім. Нежынкі! Буш паабяцаў пашкадаваць вушы слухачоў і, прынамсі, адмовіўся ад выкананьня сынглу «Вайна з Паўночнай Карэяй». Цяпер усе чакаюць лёсу дзьвюх іншых кампазыцыяў. Эўрапейская грамадзкасьць ў асобе нямецкіх і французскіх пурытанаў заявіла, што не дапусціць выхаду песьні «Вайна ў Іраку». Шматлікія прыхільнікі агрэсыўнага блэкдэзу ў роспачы.

4 Сёньня ўся Эўропа ляжыць ля ног амэрыканскага рокера Кена Лэя і ягонай псыхадэлічнай рок-опэры «Крах Энрона». Хіт распавядае пра крах сёмай па масштабу карпарацыі сьвету ENRON, якая забрала з сабой грошы 200 000 укладчыкаў і паставіла пад удар 77 відных палітыкаў ЗША. Апошнія, сярод якіх сам прэзыдэнт, дзеля фінансавай дапамогі пад час выбараў прыкрывалі махінацыі кампаніі. Сам дырэктар Энрону, даведаўшыся пра банкруцтва фірмы канчае жыцьцё самагубствам. Трагічная гісторыя! Зараз у сэнаце ЗША ідуць слуханьні новага альбому. Вось як пракамэнтаваў новы хіт вядомы амэрыканскі крытык дэмакрат Том Дашл: «Маем надзею, што крах Энрону стане бомбай сэзону. Па сваёй цяжкасьці й па ўплыву на слухачоў ён блізкі да такіх вядомых саракапятак як «Скандал Левінскі» (выканаўца Клінтан) і легендарнага «Ватэргейту» (выканаўца Ніксан).

5 Сыльвіа Берлусконі па мянушцы італьянскі прэм'ер. Яго соўл зацясаўся ў топ-парады яшчэ ў ліпені зь сінглам «Забойства карабінэрамі Джуліані ў Генуі падчас пратэстаў антыглябалістаў». Здаецца, Берлусконі адзін з нешматлікіх прадстаўнікоў сёньняшняй дум-тусоўкі, які ўрубіўся па поўнай праграме, па якой формуле трэба рабіць брутал-эклектычны шокавы тэкст. Усіх эўрапейскіх музычных недатрогаў амаль выварацила ад яго верасьнёўскага рэлізу «Superiorite du monde oxidental», што выйшаў пасьля 11 верасьня. Памятаеце, яго апошні сынгл «Уваход фашыста Фіні ў склад эўрапейскага канстытуцыйнага канвэнту ад Італіі» таксама прыйшоўся да спадобы аматарам гурту.

6 Шаноўныя аматары рэпу. Пераканаўча просім прыглядзецца й прыслухацца да маладога гурту зь Нямеччыны ЎРАД ШРЭДЭРА. Выйшла дэбютнае дэма «Фінансаваньне нацысцкай партыі НПД дзяржаўнымі структурамі». Альбом добра ўгноены цяжкімі міксамі й прыпудраны рэперскімі прыбаўткамі кшталту: «Калі ты нацыст. Ёў-ёў. І хочаш нігераў мачыць. Ёў-ёў. Завярбуйся ў спэцслужбу. Ёў-ёў. Табе дадуць грошаў і аўсвайс. Ёў-ёў. І табе будзе пляваць на закон. Ёў-ёў. Ёў, белы бразер. Ёў-ёў-ёў». Душой гурту ёсць вакал задзірыстага Отта Шылі па мянушцы міністар унутранных справаў. Кажуць, што ён, а ня Шрэдэр аўтар праекту. Некаторыя называюць твор Шылі досыць прымітыўнай імітацыяй дыска. Дэма ЎРАДУ ШРЭДЭРА ўжо аддалі на зьядзеньне крытыкам, якія прадказваюць альбому завідны лёс.

7 Сур'ёзную заяўку на месца у чартах амаль было не зрабіў поп-рокер Хайдэр і ягоны гурт СВАБОДНАЯ ПАРТЫЯ АЎСТРЫІ. Фанаты гурту апошнія гады сумавалі, з настальгіяй прыгадываючы хайдэраўскі альбом 1998 году «Ўваход праварадыкалаў ва ўрад Аўстрыі». Аднак ёсць яшчэ ягады ў ягадзіцах! Новае дэма гурту «Паездка да Садама ў Ірак» стала рэнэсансам калектыву. Дарэчы, песьня мае ўжо і відэаафармленьне. Гэта наварочаны кліп, дзе Хайдэр і Садам Хусэйн(абсалютны анфантэрыбль музычнай сцэны) блююць на ўсе грамадзкія нормы— сьпяваюць дуэтам. Як кажа сам Хайдэр, у яго мора плянаў. Прынамсі зараз аўстрыяк працуе над ролікам «Рэфэрэндум за блакаду ўваходу Чэхіі ў склад Эўрасаюзу». Па папярэдніх дадзеных гэта будзе мэгахіт, ад якога здрыганецца ўся Эўропа ●